**Литература:** 1. Перспективы развития экспорта продукции АПК Беларуси // Белорусское сельское хозяйство.- 2005.- №7. 2. Состояние, перспективы развития и государственной поддержки сельского хозяйства РБ на пути вступления в ВТО // Белорусское сельское хозяйство.- 2005.- №7. 3. В. Гусаков и др. Принципы и методы организации и функционирования хозяйственного механизма АПК в новых условиях// Агроэкономика.- 2005.- № 12. 4. Всемирная торговая организация: ориентиры для экономистов и юристов /В.Ф. Медведев и др.- Мн.: НО ООО «Бип-С», 2003. 5. Агропромышленный комплекс/ Министерство сельского хозяйства и продовольствия, Министерство статистики и анализа.- Минск, 2004. 6. Государственная программа возрождения и развития села на 2005-2010 годы. –Минск: «Издательство Беларусь»,2005.

**УДК 947.6 «1944-1955 гг.»**

## ПРАБЛЕМЫ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ (1944 – 1955 ГГ.) У ВЫКЛАДАННІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Юргевіч Н.К.**
УА «Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»

У выкладанні курса гісторыі Беларусі асаблівая цікавасць узнікае пры вывучэнні асобных яе рэгіёнаў. Даволі адметным было развіццё тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе БССР пасля 1939 г. Аднак усе мерапрыемствы, якія праводзіліся Савецкай дзяржавай, перарвала Вялікая Айчынная вайна. Аднаўленне разбуранай рэспублікі патрабавала самаадданай працы і самаахвярнасці насельніцтва. Цяжкасці пераадольваліся дзякуючы дапамозе з боку іншых рэспублік Савецкага Саюза і ўрада СССР. Пры гэтым у аднаўленні ўдзельнічала не больш 50 % даваеннай колькасці вяскоўцаў - гэта былі ў асноўным жанчыны, людзі пажылога ўзросту і падлеткі.

У Заходняй Беларусі ў першыя пасляваенныя гады моцныя пазіцыі займаў прыватны сектар. Нагадаем, што пасля вайны ў сельскай гаспадарцы заходніх абласцей рэспублікі пачалася калектывізацыя і наступленне на заможнае сялянства. Істотны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё заходнебеларускай вёскі аказвала дзейнасць антысавецкіх узброеных польскіх (Арміі Краёвай), украінскіх (бандэраўскіх), літоўскіх ("Лясныя браты"), беларускіх нацыяналістычных фарміраванняў, ставіўшых пры ўсіх нацыянальных рознагалоссях адзіную мэту – барацьбу з Савецкай уладай. Асабліва адчувальнай яна была ў Гродзенскай вобласці. "Бандыцкія групоўкі" – так Савецкай уладай характарызаваліся гэтыя фарміраванні – праводзілі тэрарыстычныя акты, забівалі мясцовых жыхароў за супрацоўніцтва з партыйнымі і савецкімі работнікамі, агітавалі не падпарадкоўвацца загадам кіраўніцтва і г.д. Тэракты Арміі Краёвай тармазілі ў пасляваенны перыяд грамадска-палітычную актыўнасць часткі заходнебеларускага насельніцтва, якое імкнулася ўдзельнічаць ў агітацыйна-масавай рабоце партыі сярод вясковага насельніцтва. Прыклады такой дзейнасці зафіксаваны амаль у кожным раёне Гродзенскай, Пінскай, Полацкай, Маладзечанскай, Брэсцкай абласцей. Гэтая акалічнасць наклала вялікі адбітак на працэсы аднаўлення народнай гаспадаркі заходніх абласцей БССР. Трэба падкрэсліць, што работнікам народнай асветы і культуры ў такіх умовах працаваць было вельмі складана, часта нават з рызыкай для жыцця. Як сведчаць архіўныя дакументы, па гэтай прычыне ў вяскоўцаў склаліся неадназначныя адносіны да культасветустаноў і культработнікаў, у радзе выпадкаў нават негатыўныя. Прывядзём архіўны дакумент - ліст ад моладзі Блажскага сельсавета, напісаны ў 1946 г., які сведчыць аб непрыманні культурнай работы, якая праводзілася загадчыкам Відзаўскага клуба Відзаўскага раёна Полацкай вобласці. "Зачем вы сегодня приезжали к нам. Вы только смешите людей. Постановками теперь уже никто не интересуется и, пожалуй, что больше сюда не показывайтесь», «наша страна никогда не признает Советской власти...» [1, ар. 6]. Менавіта па гэтай прычыне ў заходніх абласцях узнікалі цяжкасці з выкананнем закона аб усеагульным навучанні, перапісам дзяцей школьнага ўзросту, працаўладкаваннем настаўнікаў, правядзеннем мерапрыемстваў культурна-асветнымі ўстановамі.

Складанае ўнутрыпалітычнае становішча паўплывала і на працэс выбараў у Вярхоўны Савет СССР (1946 г.), у Вярхоўны Савет БССР (1948 г.), у мясцовыя Саветы (1948 г.). Пра гэта сведчаць, напрыклад, факты прыцягнення ў заходнія вобласці для аховы выбарчых участкаў армейскіх падраздзяленняў. Пэўны адбітак на культурнае развіццё пагранічнай тэрыторыі аказала пагадненне ад 9 верасня 1944 г. паміж урадамі БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення аб эвакуацыі беларусаў з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларусі. Многія беларусы-каталікі рэгістраваліся на выезд, каб выкарыстаць ільготы, якія пры гэтым даваліся дзяржавай: вызваленне ад мабілізацыі ў Чырвоную Армію, работ у прамысловасці, падаткаў, абавязковых сельскагаспадарчых паставак. Асаблівая роля ў пасляваенныя гады належала касцёлу, які значна ўплываў на жыццё заходнебеларускай вёскі. З заканчэннем вайны ён не губляў надзею на аднаўленне другой Рэчы Паспалітай, святары не ўтойвалі сваю антысавецкую пазіцыю.

На грамадска-палітычнае і культурнае жыццё заходнебеларускай вёскі ў першыя пасляваенныя гады ўплываў недахоп мясцовых кадраў (кіраўнікоў, інтэлігенцыі), што выклікала неабходнасць вяртання да практыкі 1939-1940 гг. і пераводу работнікаў дзяржапарату з усходніх абласцей у заходнія. Няве-

РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ

www.vsavm.by



данне партыйнымі работнікамі мясцовых умоў, непрыязныя адносіны да насельніцтва выклікалі шматлікія непаразуменні ва ўзаемаадносінах. Таму сялянству, асабліва ў заходніх абласцях БССР, якое прыступіла да аднаўлення гаспадаркі і культуры, давялося ў пэўнай меры адчуць на сабе каманднa-бюракратычныя у тым ліку, рэпрэсіўныя метады кіраўніцтва.

У першыя пасляваенныя гады культурнаму аднаўленню заходнебеларускай вёскі садзейнічалі дзяржаўныя асігнаванні і ініцыятыўнае будаўніцтва школ сіламі вяскоўцаў. Да прыкладу, жыхары в. Нівішча Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў 1941 г. пабудавалі пачатковую школу, але з-за ваенных дзеянняў дзецям у ёй не прыйшлося вучыцца. У пачатку вайны вяскоўцы разабралі школу і ўсе матэрыялы схавалі, аднак пасля прыходу Чырвонай Арміі школа была адноўлена і падрыхтавана да заняткаў [2, с. 211]. Добрым накірункам работы стаў удзел вясковых школ у сацыялістычным спаборніцтве, якое садзейнічала будаўніцтву новых школьных будынкаў, выяўленню школ з наёмных памяшканняў, уладкаванню прышкольных тэрыторый і інш. Пэўныя цяжкасці існавалі з забеспячэннем вясковых школ падручнікамі, сшыткамі, дадатковым вучэбным абсталяваннем, паперай.

Адной са складаных праблем ў заходніх абласцях БССР стаў перавод украінскіх і польскіх школ на беларускую і рускую мовы навучання, што выклікала масавае супраціўленне насельніцтва. Напрыклад, у 1944 г. у Гродзенскі РК КП(б)Б і АблАНа неаднаразова звярталіся дэлегацыі бацькоў вучняў з в.в. Парэчча, Індуры, м. Малая Капліца з хадайніцтвам замест беларускіх і рускіх школ, якія існавалі там да пачатку вайны, адкрыць польскія па той прычыне, што большасць насельніцтва размаўляла на польскай мове [3, воп. 17, с. 20, ар. 97].

Несумненна, у заходніх абласцях, дзе абсалютная большасць насельніцтва была веруючай, вельмі вялікім быў уплыў прадстаўнікоў рэлігійнага культа. А паколькі матэрыяльная база вясковых школ даволі доўгі час заставалася слабай, вельмі часта выхаваўчую функцыю бралі на сябе святары і манахі (напрыклад, у Здзітаўскай, Бярозаўскай, Раснянскай школах Брэсцкага і іншых раёнаў Брэсцкай вобласці), якія збіралі вучняў для навучання малітвам і рэлігійным звычаям. Разам з тым, дзяцей вучылі гуляць у валейбол, "гарадкі" [4, ар. 10]. Захавалася сведчанне, што ў Свірскім раёне Маладзечанскай вобласці ў 1944-45 навучальным годзе пры касцёле існаваў фізкультурны гурток пад кіраўніцтвам манашкі [3, ар. 127]. Архіўныя дакументы падаюць і такія выпадкі, калі ў рэлігійныя пасты дзеці адмаўляліся гуляць і пець песні, бо гэта забараняла каталіцкая царква.

Пасля вайны дзяржава імкнулася вырашыць праблему падрыхтоўкі прафесійных кадраў для школ рэспублікі праз адкрыццё педвучылішчаў, інстытутаў, завочных аддзяленняў пры іх і курсавую сістэму. Нягледзячы на такія мерапрыемствы, у вясковых школах часта не хапала настаўнікаў, нізкім быў іх кваліфікацыйны ўзровень, школы працавалі ў 2-3 змены, існавалі класы-камплекты. Гэта адбывалася па той прычыне, што дапускаліся сур'ёзныя пралікі з планаваннем падрыхтоўкі педагагічных кадраў для агульнаадукацыйных школ БССР у разрэзе спецыяльнасцей. Саўнаркам СССР пастановай ад 22 сакавіка 1945 г. «О мерах помощи школам Западной Беларуси» прапанаваў рээвакуіраваць усіх настаўнікаў-беларусаў у распараджэнне Наркамасветы БССР для работы ў заходніх абласцях. Да прыкладу, у 1945 г. усходнія вобласці рэспублікі накіравалі для працы на захадзе 400 настаўнікаў I-IY класаў [1, ф. 2797, воп. 1, с. 7, ар. 86]. Праўда, такія рашэнні дакладна не выконваліся, бо і ва ўсходніх абласцях недахоп у кваліфікаваных педагагічных кадрах быў вялікім. Недахоп настаўнікаў у заходніх абласцях Беларусі адчуваўся і ў канцы 40-х – пач. 50-х гг. У некаторых раёнах, напрыклад, у Маладзечанскай вобласці ў 1947 г. па гэтай прычыне не працавала да 50 % вясковых школ. Кадравая праблема ў сельскай мясцовасці заходніх абласцей была настолькі адчувальнай, што некаторыя з іх у 1945-46 гг., напрыклад, паўднёва-заходнія раёны Маладзечанскай вобласці, былі выдзелены ў першую групу забеспячэння па штатах, зарплаце, літаратуры [5, ар. 8].

Адзначым, што на замацаванне кваліфікаваных кадраў у заходніх абласцях БССР быў накіраваны загад Міністэрства асветы БССР № 24 ад 20 кастрычніка 1946 г., які ва ўсходніх абласцях дазваляў перамену месца работы па асабістых заявах настаўнікаў, а ў заходніх - толькі ў выключных выпадках (па ўважлівых прычынах). Без дазволу ўпраўлення кадраў Міністэрства асветы БССР забараняўся выезд настаўнікаў за межы рэспублікі, а таксама звальненне і перавод з адной школы ў другую тых настаўнікаў 8-10 класаў, якія мелі закончаную вышэйшую адукацыю [1, ф. 2797, воп. 1, с. 7, ар. 22].

Патрэбна адзначыць, што значная частка настаўнікаў пасляваеннай беларускай школы не мела не толькі педагагічнай, але сярэдняй і нават няпоўнай сярэдняй адукацыі. Як адзначаюць архіўныя дакументы, пад пастаянным і дастаткова жорсткім кантролем улады знаходзіўся якасны склад пасляваеннага настаўніцтва. Якім ён быў, можна меркаваць па наступнаму прыкладу. Па стану на 1 студзеня 1947 г. педагагічныя кадры Маладзечанскай вобласці былі прадстаўлены наступным чынам: з 2558 настаўнікаў, якія працавалі ў школах, 1472 знаходзіліся ў гады вайны на акупіраванай немцамі тэрыторыі, 255 працавалі ў нямецкіх школах, праходзілі нямецкія курсы 169 чалавек, 475 закончылі польскія навучальныя ўстановы; з іх 1714 мелі няпоўную сярэднюю адукацыю, 140 сярэднюю [3, ф. 42, воп. 4, с. 22, ар. 9-10]. Пасля Вялікай Айчыннай вайны дзяржава не давярала грамадзянам, у тым ліку вясковым настаўнікам, якія, хоць і не па сваёй віне, апынуліся на акупіраванай немцамі тэрыторыі.

Характэрнай асаблівасцю ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе было камплектаванне спачатку школ сталіцы, абласных і раённых цэнтраў і толькі потым вясковых школ. Прычым вялікая колькасць выпускнікоў навучальных устаноў не жадала праца-

www.vsavm.by



ваць у сельскай мясцовасці і не прыязджала да месца работы. Няўважлівыя адносіны мясцовага кіраўніцтва да патрэб сельскай інтэлігенцыі прыводзілі да таго, што настаўнікі не атрымлівалі прадуктаў харчавання, прамысловых тавараў, жылля, нават зарплату часта выплачвалі са спазненнем на некалькі месяцаў. У выніку бескантрольнасці мясцовых улад за выкананнем пастаноў і загадаў СНК БССР і Міністэрства адукацыі аб забеспячэнні вясковых настаўнікаў прадуктамі харчавання, многія з іх знаходзіліся ў вельмі дрэнным матэрыяльным становішчы. Да прыкладу, настаўніца Обухаўскай школы Скідзельскага раёна Гродзенскай вобласці гр. Ш. з-за беднасці ўсё лета працавала ў заможных сялян; настаўнікі Гожскай школы Сапоцкінскага раёна гэтай вобласці атрымоўвалі прадукты харчавання ад бацькоў школьнікаў; настаўнікі ў Крывіцкім, Мядзельскім, Ільянскім, Іўеўскім раёнах Маладзечанскай вобласці адпрацоўвалі прадукты харчавання ў дамашняй гаспадарцы бацькоў вучняў і заможных сялян [3, ф. 42, воп. 4, с. 8, ар. 322]. Такое становішча выклікала частую зменнасць сярод настаўнікаў, якія імкнуліся ўладкавацца ў арганізацыі, дзе іх лепш забяспечвалі.

Вельмі часта настаўнік у вёсцы з'яўляўся адзінай адукаванай асобай, якой маглі даручаць выкананне важных партыйных і савецкіх дырэктыў. У выніку атрымлівалася, што вясковы настаўнік быў вымушаны ўдзельнічаць ва ўсіх дзяржаўных мерапрыемствах: у ліквідацыі непісьменнасці, правядзенні выбараў, наладжванні культурна-масавай работы, правядзенні лекцый на сельскагаспадарчыя тэмы, у зборы падаткаў. Зыходзячы з такога разумення ролі настаўнікаў у жыцці пасляваеннай беларускай вёскі, улады патрабавалі ад іх павышэння палітычнай падрыхтаванасці праз вывучэнне гісторыі УКП(б) і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Адзначым, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці, настаўнік карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод вясковага насельніцтва.

Пэўныя праблемы ў заходніх абласцях БССР існавалі пры выкананні закону аб усеагульным абавязковым навучанні. Вялікую шкоду нанесла вайна – многа дзяцей апынулася ў дзіцячых дамах альбо на патранаце, некаторыя займаліся жабрацтвам і не мелі пэўнага месца жыхарства. Нават дзеці, якія мелі бацькоў ці аднаго з іх, па пэўных прычынах не наведвалі школу (слабы бюджэт вясковай сям'і, вялікая адлегласць школы ад месца жыхарства, нежаданне бацькоў пасылаць дзяцей у школу, праца ў калгасах ці ў дамашняй гаспадарцы). Да канца чацвёртай пяцігодкі (1946-1950 гг.) удалося здзейсніць пераход да ўсеагульнай сямігадовай адукацыі ў сельскай мясцовасці, аднак прыцягнуць да вучобы ўсіх дзяцей аказалася складана. Дрэнна паўплывала на атрыманне сярэдняй адукацыі (вучоба ў YIII-X класах) увядзенне платнага навучання. І хоць пэўную дапамогу аказвалі дзяржава і самі школы: дапамагалі матэрыяльна, стваралі фонды ўсенавуча, выдзялялі бясплатныя сняданкі – аднак у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе закон усеагульнага абавязковага навучання ў заходніх абласцях рэспублікі так і не быў выкананы.

Даволі складанай праблемай у аднаўленні пасляваеннай вёскі было навучанне сельскай моладзі, якая ў выніку вайны не змагла атрымаць адукацыю і па свайму ўзросту не падыходзіла да навучання ў агульнаадукацыйнай школе. З мэтай здзяйснення гэтага пытання былі выдадзены пастановы СНК СССР за № 329 ад 6 ліпеня 1944 г. аб стварэнні школ сельскай моладзі і СНК БССР ад 4 верасня 1944 г. аб арганізацыі школ рабочай і сельскай моладзі [3, ф. 42, воп. 42, с. 4, ар. 53]. У пасляваеннае дзесяцігоддзе вячэрнія школы сельскай моладзі былі двух тыпаў: пачатковыя (I-IY класы) і сямігадовыя (I-YII класы). Яны пачыналі свой навучальны год з 1 лістапада. Дзяржава прадугледзела бясплатнае навучанне ў вячэрніх школах і абавязвала мясцовыя арганізацыі забяспечваць рабочых-навучэнцаў дадаткова зверх нормаў 100 г хлеба, 30 г крупы, 20 г цукру ў дзень [6, ар. 10]. Аднак сельская моладзь не заўсёды магла арганізаваць свой час і сумяшчаць працу з вучобай. Пэўны адбітак наклала праца ў калгасах, бо кіраўніцтва сельсаветаў і калгасаў не жадала ўлічваць інтарэсы рабочых навучэнцаў, а ў многіх выпадках і перашкаджала вучэбнаму працэсу (прыцягванне да працы ў вячэрні час, камандзіровак).

Навучанне дарослага насельніцтва (яно ў асноўным было непісьменным) заходнебеларускай вёскі праходзіла больш складана, бо гэтаму перашкаджалі пэўныя стэрэатыпы ў жыцці грамадства – "вучобай павінна займацца маладое пакаленне". Возьмем у якасці прыкладу Гродзенскую вобласць. Тут на канец 1946 г. было 16466 непісьменных, малапісьменных – 22320 чалавек, а навучалася ў групах граматы адпаведна 1782 (10,8 %) і 3718 (16,6 %) чалавек [3, ф. 42, воп. 4, с. 18, ар. 54]. У выніку ў шмат якіх раёнах БССР пастановы аб навучанні грамаце вяскоўцаў пасля вайны не заўсёды выконваліся належным чынам, таму нельга гаварыць аб тым, што ў сяр. 50-х г. поўнасцю была ліквідавана непісьменнасць заходнебеларускага насельніцтва.

Больш марудна адбывалася аднаўленне культурна-асветных устаноў заходнебеларускай вёскі. У пасляваенныя гады культурна-асветная дзейнасць органаў масавай інфармацыі, народнай адукацыі і культуры павінна была дапамагчы вырашыць у першую чаргу галоўную праблему – аднавіць народную гаспадарку БССР і сельскую гаспадарку ў прыватнасці.

Будаўніцтва метадам народнай ініцыятывы і дзяржаўныя асігнаванні спрыялі ўзвядзенню ў многіх раёнах будынкаў для культустаноў, колькасць якіх з кожным годам павялічвалася. Як сведчаць архіўныя дакументы, культасветустановы займаліся распаўсюджваннем навукова-грамадзянай, агразаатэхнічнай, прапагандысцкай дзейнасцю і, на жаль, у меншай ступені мерапрыемствамі, звязанымі з культурай і мастацтвам.

Трэба адзначыць, што ў выніку дрэннага фінансавання культасветустаноў сельсаветамі, нізкага кваліфікацыйнага ўзроўню культработнікаў, частай іх зменнасці шмат якія ўстановы развіваліся марудна. Рэшткавы прынцып фінансавання

www.vsavm.by



культурна-асветных устаноў прыводзіў да таго, што ў заходнебеларускай вёсцы на працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя не хапала самага неабходнага для развіцця культурнага ўзроўню сельскага насельніцтва - кніг, газет, часопісаў, радыёпрыёмнікаў, кінаапаратуры і інш. На капітальны і бягучы рамонты культустаноў дзяржава ніякіх сродкаў не выдзяляла, таму грошы, якія асігнаваліся на набыццё кніг і гаспадарчыя расходы, ішлі часцей за ўсё на рамонт памяшканняў. Архіўныя дакументы сведчаць, што часта выдзеленыя сродкі не асвойваліся, напрыклад, у 1952 г. сельскія бібліятэкі Лідскага раёна Гродзенскай вобласці з 9 тыс. рублёў выкарысталі ўсяго 2800 руб., Зельвенскага - з 20 тыс. толькі 9 тыс. рублёў, а Парфёнаўская, Курылавіцкая, Міжэвіцкая сельскія бібліятэкі Мастоўскага раёна не атрымалі ні рубля, хаця ім было выдзелена 6500 руб. [7, ар. 35]. Справа даходзіла да таго, што гаспадары уласных дамоў, дзе знаходзіліся хаты-чытальні і за якія сельсаветы не выплочвалі арэндную плату, адмаўлялі ў далейшым утрыманні культасветустаноў. Такія прыклады зафіксаваны ў Княжынскай, Саніцкай хатах-чытальнях Пастаўскага, Драбышанскай хаце-чытальні Юрацішкаўскага раёнаў Маладзечанскай вобласці [1, ф. 2806, воп. 1, с. 8, ар. 349 - 350].

Не заўсёды ўважлівыя адносіны мясцовых улад да патрэб культустаноў уплывалі на эфектыўнасць іх работы. Напрыклад, у 1948 г. Радашковіцкі РК КП (б)Б Маладзечанскай вобласці не адвёў нават рабочае месца для загадчыка райкультасветаддзела, зарплату культасветработнікі не атрымлівалі па 2-3 месяцы. Неверагодны, аднак, факт: старшыня Крывіцкага райвыканкама гэтай вобласці гр. Н. пытанне фінансавання культурна-асветных устаноў вырашаў так: «Идите (культработнікі – аўт.) к таким-то крестьянам, «выколачивайте» деньги от них и берите себе» [5, с. 42, ар. 140].

Патрэбна адзначыць, што дастаўка перыядычных выданняў у аддаленыя вёскі была настолькі дрэннай, што газет не атрымлівалі нават агітатары і сельская інтэлігенцыя. У выніку адсутнасць друкаванага слова ў сваю чаргу адмоўна ўплывала на стан палітмасавай і агітацыйнай работы сельскіх культурна-асветных устаноў. Пэўныя праблемы для агітатараў складала хутарская сістэма, напрыклад, у Воранаўскім раёне Гродзенскай вобласці па гэтай прычыне вельмі часта распаўсюджваліся розныя чуткі наконт Савецкай улады [7, ф. 1, воп. 1, с. 2289, ар. 9].

Трэба адзначыць, што пасля вайны дзяржава праводзіла радыёфікацыю беларускай вёскі. Выконваючы пастанову ЦК УКП(б) «О мерах помощи по развитию радиофикации и радиовещания в западных областях Белорусской ССР», мясцовыя органы ўлады радыёфікавалі ў 1945 г. 150 населеных пунктаў, на сяле былі пабудаваны 34 радыёвузлы і ўстаноўлены 2468 радыёкропак і 64 эфірныя радыёпрыёмнікі [3, воп. 47, с. 27, ар. 146]. Аднак архіўныя дакументы дазваляюць зрабіць выснову, што ў першыя пасляваенныя гады радыё ўваходзіла ў хаты калгаснікаў вельмі марудна: радыёпрыёмнікаў пасля вайны выпускалася мала, у магазінах іх практычна не было, да іх не прадавалі запчасткі. Часта атрыманыя вобласцю радыёпрыёмнікі не даходзілі да сельскіх культурна-асветных устаноў, а тыя, што дастаўляліся, не працавалі з-за адсутнасці радыёбатарэй і радыёлямпаў. Напрыклад, у 1949 г. з завезеных у Гродзенскую вобласць 354 радыёпрыёмнікаў 20% не працавала з-за адсутнасці радыёбатарэй, а 10% з-за пашкоджанняў лямпаў [7, с. 14, ар. 322]. Станоўчай з'явай у пасляваенныя гады было з'яўленне радыёгурткоў пры сельскіх і гарадскіх школах, у якіх падлеткі стваралі самыя простыя радыёпрыёмнікі для калгаснікаў.

Патрэбна адзначыць, што тэлебачанне ў Беларусі ў пасляваенныя гады рабіла толькі першыя крокі, недасканалай была яго тэхніка, мала выпускалася тэлевізараў. Пагэтаму ў вёсцы іх кампенсавалі кінаперасоўкі. Дэманстрацыя кінафільмаў заўсёды была на сяле вялікай з'явай, прыцягвала большасць вясковых жыхароў. ЦК КП(б)Б неаднойчы абмяркоўваў пытанні, звязаныя з паляпшэннем дзейнасці органаў кінафікацыі. У прыватнасці, 29 жніўня 1950 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняла пастанову "О состоянии и мерах по улучшению кинообслуживания сельского населения", якая была скіравана на ўдасканаленне кінаабслугоўвання, асабліва ў сельскай мясцовасці.

Кіраўнікі мясцовай улады, калгасаў і саўгасаў абавязаліся выдзяляць транспарт для перавозкі кінафільмаў, апаратуры і памяшканняў для іх дэманстрацыі, строга вытрымліваць графікі дэманстрацыі кінафільмаў, асабліва для дзіцячай аўдыторыі. Аднак кінаабсталяванне ў першыя пасляваенныя гады было даволі зношаным, часта ламалася, паказ кінафільмаў быў у некаторых выпадках стратнай з'явай. У выніку вясковыя жыхары бачылі кінафільмы даволі рэдка, асабліва ў аддаленых ад райцэнтраў вёсках. Заўважым, што цікавасць вяскоўцаў да кіно з кожным годам павялічвалася, нягледзячы на тое, што ў сельскай мясцовасці адсутнічалі памяшканні культасветустаноў ці не былі належным чынам прыстасаванымі для дэманстрацыі фільмаў.

Такім чынам, першая пасляваенная дзесяцігодка з'явілася важным этапам у гісторыі культуры заходнебеларускай вёскі. За гэтыя гады ў асноўным былі ліквідаванымі цяжкія наступствы вайны, адбыліся змяненні ў сацыяльным становішчы сельскіх жыхароў, узрос іх культурны ўзровень. Вынікі дасягаліся дзякуючы вырашэнню асноўных агульнапалітычных задач, і галоўнай з іх - аднаўлення і развіцця сельскай гаспадаркі. Недахоп кваліфікаваных спецыялістаў і дрэннае фінансаванне стрымлівалі культурнае развіццё заходнебеларускай вёскі пасля вайны. Тым не менш, працэсы аднаўлення ўстаноў адукацыі і культуры, удасканалення іх працы насілі адназначна скіраваны характар – завяршыць аднаўленне культурнай структуры пасляваеннай вёскі якасна і ў самы кароткі тэрмін.

**Літаратура:** 1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 10060, воп. 1, с. 68. 2. Освобождённая Беларусь. – Документы и материалы. – В 2-х кн. Кн. 1. Сентябрь 1943

www.vsavm.by



– декабрь 1944. / Сост.: В.И. Адамушко и др. – Мн.: НАРБ, 2004. – 398 с. 3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4, воп. 20, с. 217. 4. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1, воп. 2, с. 211. 5. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. Ф. 4629, воп. 3, с. 3. 6. Занальны дзяржаўны архіў г. Глыбокае. Ф. 535, воп. 1, с. 3. 7. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці. Ф. 838, воп. 1, с. 35.

**УДК 636.2.033**

## СОЗДАНИЕ МЯСНОГО СТАДА ГЕРЕФОРДСКОЙ ПОРОДЫ В ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

**Лазовский А.А., Линник Л.М.**
УО «Витебская государственная академия ветеринарной медицины»
**Славецкий В.Б., , Шебалов В.Н.**
Облсельхозпрод, г. Витебск
**Корбан Г.С.**
Госплемпредприятие, г.Витебск

Взятый курс на интенсификацию развития отрасли молочного скотоводства будет способствовать дальнейшему увеличению производства молока за счет организации кормопроизводства, улучшения кормления и совершенствования селекционно-племенной работы с животными. Поэтому для увеличения производства говядины и улучшения ее качества назрела явная необходимость использовать мясные породы скота, как при чистопородном разведении, так и в промышленном скрещивании с низкопродуктивными черно-пестрыми коровами и первотелками для создания стад мясного типа.

Важным преимуществом развития мясного скота перед другими отраслями животноводства является невысокая энергоемкость, низкая трудоемкость, использование естественных кормовых угодий, хорошая адаптация животных к условиям окружающей среды и выращивание телят под коровами-кормилицами. Говядина от мясного скота имеет высокие вкусовые, питательные и кулинарные качества.

Целью нашей научно-исследовательской работы является создание стад мясного направления в Витебской области от низкопродуктивных коров черно-пестрой породы с быками герефордской породы.

Задачи по созданию отрасли мясного скотоводства в Витебской области определены решением облисполкома от 7.12.2001г, в соответствии с которым для развития отрасли было выделено вначале 161 хозяйство, а в 2005 – 192 с численностью маточного поголовья 22 тыс. голов. Создание мясного стада в хозяйствах области проводится с использованием поглотительного скрещивания, путем осеменения низкопродуктивных коров и сверхремонтных телок черно-пестрой породы семенем быков герефордской породы (племенные), а также промышленного скрещивания с целью получения помесей I поколения (товарные).

Выбор герефордской породы при создании мясного стада в Витебской области оказался неслучайным. Животные данной породы хорошо акклиматизируются, приспосабливаются к холодным зимам за счет образования густого подшерстка, стойко передают помесному молодняку отличительные особенности масти (белоголовость, курчавость волосяного покрова), неприхотливы в кормах и хорошо нагуливаются на естественных пастбищах, отелы проходят легко, и самое главное, обладают хорошими мясными качествами. Мясо герефордов тонковолокнистое, равномерно прослоено внутримышечным жиром, отличается высокими пищевыми достоинствами. Живая масса быков-производителей составляет 850-1000 кг, коров – 600-650 кг, выход туши – 58-62%, выход мякоти на 1 кг костной ткани – 5,2 кг.

Животные герефордской породы имеют хорошо выраженный мясной тип и характеризуются короткой, хорошо обмускуленной шеей, сильно развитым подгрудком, глубоким и широким туловищем с хорошо развитой мускулатурой, особенно на пояснице и окороках. Масть герефордского скота темно-красная с белой окраской головы, горла, подгрудка, брюха нижней части ног и кисти хвоста. У большинства животных имеется белая отметина различной величины на холке и спине, хотя этот признак считается необязательным. Темперамент животных спокойный. В породе имеются комолые особи, что облегчает обслуживание животных.

Создание чистопородного племенного стада в области проводится в ЗАО «Липовцы» Витебского района путем скрещивания черно-пестрых коров с быками герефордской породы с получением помесей IV-V поколения с хорошо выраженным мясным типом телосложения и типичной окраской волосяного покрова для герефордской породы. Процесс получения чистопородных животных длительный (15 лет и более), а поэтому в процессе разведения животных при получении типичных телочек и бычков III-IV поколения их необходимо оценивать по энергии роста. Животных с величиной среднесуточного прироста 1100 г и выше необходимо использовать для закладки линий. С этой целью Витебское госплемпредприятие в 2005 году приобрело в Швеции 3-х быков герефордской породы Викинг №2854 и полубратьев Викинг Ванга №2852 и №2853, а так же семя быка Дайса №750029, импортированное из Канады в количестве 250 спермодоз. Комплексный класс вышеуказанных быков – элита-рекорд, а энергия роста на уровне 1100 г.

В настоящее время стадо мясного скота в ЗАО «Липовцы» Витебского района представлено 148 коровами и 150 телками I поколения, 55 телками II поколения. В течение 2006 года будет получено 170